## XII МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ» У МДЛУ

5 красавіка 2013 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму пры актыўнай дапамозе аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі праведзена XII міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць».

Адкрываючы канферэнцыю, прарэктар універсітэта А.М. Гарлатаў зазначыў, што ў праграме заяўлены выступленні больш 50 удзельнікаў, у тым ліку далёкіх гасцей з Германіі (Берлін, Фленсбург), Латвіі (Рыга), Расіі (Арэнбург, Масква), Украіны (Днепрапятроўск). Асноўныя заяўкі на ўдзел у канферэнцыі паступілі ад беларускіх, галоўным чынам, мінскіх даследчыкаў, сярод якіх і некалькі аспірантаў. Прамоўца пакрэсліў, што гэта сустрэча праходзіць у адметны год у гісторыі Беларусі: мінула 70 гадоў, як была вызвалена беларуская зямля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Менавіта юбілейнай гадавіне прысвечана канферэнцыя, якая прайшла ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гісторыя, культура, грамадства і дзяржава» (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар А.А. Каваленя). Заданне «Ваенная гісторыя» (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук,

прафесар А.М. Літвін) выконваецца кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.Я. Новікаў).

У заключэнне прарэктар выказаў у адрас удзельнікаў канферэнцыі пажаданні ўдачы, поспехаў і спадзяванні на тое, што ў ходзе сустрэчы гісторыкі зробяць важны крок у напрамку ўзбагачэння айчыннай гістарыяграфіі новымі знаходкамі, цікавымі не толькі для шырокай навуковай грамадскасці, але і для цяперашняга студэнцтва.

Выступленні былі сфакусіраваны вакол трох праблемных палёў, сярод якіх: 1) Вялікая Айчынная вайна як аб’ект навукі і сімвал памяці; 2) Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: новыя дакументальныя знаходкі і гістарыяграфічныя ацэнкі; 3) Беларусь праз прызму часу: ваенная гісторыя, мірныя людзі і іх незабыўныя лёсы.

Канферэнцыя працавала ў фармаце пленарных пасяджэнняў, на якіх прадугледжваўся разгляд шырокага спектра розных пытанняў. Цягам цэлага дня ішлі плённыя дыскусіі з удзелам як масцітых прафесіяналаў, так і пачынаючых даследчыкаў, аспірантаў і суіскальнікаў, хто атрымаў практычныя ўрокі ў сферы распрацоўкі праблем ваенна-гістарычнай навукі. Фактычна кожнае пленарнае пасяджэнне ўяўляла сабой самастойную міні-канферэнцыю, у цэнтры якой знаходзілася самая розная тэматыка.

У ходзе першага пасяджэння «Вялікая Айчынная вайна як аб’ект навукі і сімвал памяці» былі заслуханы навуковыя даклады айчынных і замежных даследчыкаў, у тым ліку: Н.А. Яцкевіч (Мінск), С.Я. Новікава (Мінск), У.І. Кузьменка (Мінск) і У.В. Фядзюніна (Масква), а таксама паведамленні.

Прадстаўленыя навуковыя матэрыялы і іх абмеркаванне яшчэ раз пераканалі ўдзельнікаў у тым, што чым далей ад нас застаюцца ў гісторыі падзеі ваенных гадоў, тым больш раскрываюцца іх таямніцы і тым старанней павінен праводзіцца навуковы аналіз падзей Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі. Наглядным доказам гэтаму сталі даклады вядучага архівіста Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Н.А. Яцкевіч і загадчыка кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ С.Я. Новікава. У фокусе першага выступлення апынулася трагедыя Хатыні, якая стала сімвалам нацыянальнай памяці беларускага народа. Архівіст прыйшла да важнай высновы, што па цяперашні час ідзе раскрыццё таямніц Хатыні. Нягледзячы на абмежаваную дакументальную базу па ўсебаковым вывучэнні трагедыі, гэта тэма, як і тэма знішчэння шматлікіх беларускіх вёсак, з’яўляецца квінтэсенцыяй разумення Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі ў 1941–1944 гг. Яна ўздымае перад гісторыкамі два важных пытанні: хто і чаму здзейсніў гэта злачынства супраць безабароннага мірнага насельніцтва? Вывучыць і агучыць гэтыя патанні ў савецкі час было практычна немагчыма па зразумелых прычынах. У цяперашні ж час яны патрабуюць ўсебаковага вывучэння, аналізу і шырокага адлюстравання ў падручніках па гісторыі, а таксама ў навукова-папулярнай літаратуры для сучаснага грамадства, і ў першую чаргу для моладзі.

У другім дакладзе С.Я. Новікаў на аснове выкарыстання новых, пакуль малавядомых матэрыялаў, у тым ліку з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Цэнтральнага архіва ФСБ РФ, прапанаваў высветліць навуковую верагоднасць гістарычных фактаў, замацаваных у айчыннай гістарыяграфіі ў дачыненні да месцаў масавага знішчэння на тэрыторыі лагера смерці Трасцянец. Галоўны вывад, да якога прыйшоў даследчык, заключаецца ў тым, што параўнаўчы аналіз выяўленай на цяперашні час дакументальнай базы крыніц дазваляе не толькі звярнуць увагу на неабходнасць больш крытычнага, узважанага і ўсебаковага вывучэння ўсяго комплексу дакументальных крыніц, але і ставіць на парадак дня беларускай гістарыяграфіі задачу аб правядзенні спецыяльнага навуковага даследавання па гэтай гістарычнай тэме з улікам дасягненняў навейшай тэорыі і метадалогіі, асабліва вынікаў кампаратыўнага аналізу айчынных і замежных крыніц з мэтай атрымання новых навуковых ведаў.

На адметнасцях беларускай культуры ва ўмовах нацысцкай акупацыі спыніўся вядомы беларускі ваенны гісторык У.І. Кузьменка. Ён адзначыў, што на акупаванай тэрыторыі Беларусі адбылося сутыкненне культур і ідэалагічных установак, з аднаго боку – культурных памкненняў нацызму і мясцовай калабарацыі, а з другога – антыфашысцкага, прасавецкага лагера. У такой схватцы пераважыла моц савецкіх ідэй, духоўны моц мільёнаў людзей, якія супрацьстаялі «карычневай чуме», што несла пагрозу ўсяму свету. У дачыненні да Беларусі можна сцвярджаць, што 5 дзесяткаў калабарацыйных газет прайгравалі антыфашасцкаму партызанскаму друку і вуснай агітацыі ў працэсе разгорнутай на той час барацьбе за свядомасць людзей.

У.В. Фядзюнін спыніўся на разглядзе баявога лёсу палкоўніка А.П. Кузняцова – дэпутата Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 1-га склікання, які напярэдадні вайны камандаваў 17-м Чырвоназнаменным Цімкавічскім пагранічным атрадам пагранічных войскаў НКУС СССР і быў узнагароджаны Ганаровым знакам «Заслужаны работнік НКУС СССР». Маскоўскі даследчык заключае, што для ваеннай гісторыі цікавымі з’яўляюцца лёсы ўсіх без выключэння удзельнікаў тых падзей, хто ў самыя першыя хвіліны германскай агрэсіі стаў на яе шляху і даў адпор ворагу. У пераліку такіх імёнаў стаіць маёр А.П. Кузняцоў, хто разам з падначаленымі яму пагранічнікамі рашуча прыняў абарону Брэсцкай крэпасці летам 1941 года.

Сярод паведамленняў асаблівы інтарэс выклікалі выступленні В.Л. Буракова аб Брэсцкай крэпасці напярэдадні і ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны, В.В. Брыгадзінай на тэму франтавога побыту савецкіх ваеннаслужачых у гады Вялікай Айчыннай вайны, Я.А. Грэбеня пра настрой насельніцтва Беларусі ва ўмовах нацысцкай акупацыі 1941–1944 гг., А.М. Дакуновай у дачыненні да арганізацыі аховы савецкіх ваеннапалонных у лагерах на акупаванай тэрыторыі Беларусі, Э.Р. Іофе аб колькасці дэпартаваных яўрэяў ў Мінскім зондэргета і Трасцянецкім лагеры смерці. Д.А. Козел цікава распавёў пра аператыўную групу Бела-рускага штаба партызанскага руху на 2-м Беларускім фронце, С.В. Кулінка – пра дзейнасць

нямецкіх разведвальна-дыверсійных і шпіёнскіх школ на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (на матэрыялах дакументаў Беларускага штаба партызанскага руху). І.Я. Куракова выклала рэдкія звесткі на тэму цэнаўтварэння як элемента германскага фінансавага рабавання тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг., У.П. Мароз паведаміў аб правядзенні першачарговых мерапрыемстваў па аднаўленні гарадоў БССР (восень 1943 г. – лета 1944 г.), В.М. Матаха аб дакументах дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці як крыніцы ведаў па гісторыі Мінска ў перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі 1941–1944 гг., А.Г. Цымбал пра колькасныя аспекты выкарыстання мясцовых працоўных рэсурсаў акупацыйнымі ўладамі ў святле калекцыі дакументаў галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск», В.А. Латышава аб палітыцы нацысцкай Германіі ў дачыненні да душэўна-хворых на акупаванай тэрыторыі Беларусі 1941–1944 гг.

На другім пленарным пасяджэнні прагучалі даклады К.Зеліса (Рыга), У.В. Здановіча (Брэст), А.М. Літвіна (Мінск), А.В. Шаркова (Мінск) і К. Ганцара (Ляйпцыг).

Разглядаючы гэту тэму ў дакладзе «Другая сусветная вайна паміж гістарыяграфіяй і сацыяльнай памяццю ў Латвіі», вядомы латышскі ваенны гісторык К. Зеліс звярнуў ўвагу на шлях, які давялося прайсці навуковым ведам за пасля-ваенны час у розных сферах жыцця грамадства, у тым ліку ў гістарыяграфіі. Погляды гісторыкаў на падзеі вайны ў сучаснай Латвіі і тыя ацэнкі, якія яны атрымалі ў другой палове XX ст. у навуковай літаратуры, на цяперашні час не заўсёды захоўваюцца ў памяці людзей. Таму перад гісторыкамі стаіць актуальная задача аб зближэнні дзеянняў навуковай і грамадскай сфер у агульнай справе пазнання ваеннага мінулага і яго захавання ў памяці нашчадкаў.

У.В. Здановіч, прадстаўляючы вынікі даследавання баявых падзей летам 1941 г. на тэрыторыі Беларусі сучаснай беларускай гістарыяграфіяй, звяртае ўвагу на некалькі актуальных праблем, звязаных з неабходнасцю далейшага вывучэння гэтай праблематыкі пад вуглом крытычнага аналізу агульна-вядомых фактаў, трывала замацаваных у гістарычнай літаратуры, і іх параўнання з новымі дакументальнымі крыніцамі, уведзенымі ў шырокі навуковы ўжытак гісторыкамі суверэннай Беларусі. Апроч таго, на думку гісторыка, на парадак дня выходзіць задача правядзення спецыяльнага навуковага даследавання, пабудаванага на аснове як новых дакументальных крыніц, так і новых навуковых падыходаў. На аснове гэтага можна будзе чакаць новую якасць гістарычных ведаў у дачыненні да асобных мала-вядомых старонак ваеннай гісторыі Беларусі летам 1941 года.

У чарговы раз А.М. Літвін звярнуўся да пытання аб турэмных надпісах, пакінутых вязнямі турмаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў перыяд нацысцкай акупацыі 1941–1944 гг. Даследуючы надпісы на турэмных сценах Магілёва, гісторык адзначыў той факт, што, апрача Магілёва, такія надпісы выяўлены ў турмах Гомеля, Пінска, Кобрына, Віцебска, Оршы, Мінска, Стоўбцаў, Ліды і Навагрудка. Прыводзячы канкрэтныя надпісы з двух камер

гэтай турмы, аўтар звяртае ўвагу на той факт, што на цяперашні час дакументы даюць магчымасць аднавіць толькі імёны тых, хто знаходзіўся ў турме. Аднак пакуль застаецца адкрытым другі бок тых людскіх гісторый, збору біяграфічных звестак пра кожнага вязня. На думку даследчыка, гэта актуальная задача застаецца пакуль нявырашанай для беларускіх гісторыкаў.

Да ліку маладаследаваных А.В. Шаркоў аднёс гісторыю цыган Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Выступаючы з дакладам, даследчык адзначыў, што выяўленыя на цяперашні час дакументы пераконваюць у тым, што ў гады германскай акупацыі трагічны лёс дастаўся і беларускім цыганам, якіх акупанты разглядалі ў якасці аднаго з аб'ектаў расавай ідэалогіі і нацысцкай палітыкі вынішчэння на тэрыторыі Беларусі, дзе загінулі звыш 3 тыс. цыганоў. На фоне рознабаковага даследавання ваеннай тэматыкі гэта праблема пакуль не мае грунтоўных напрацовак і спецыяльнага гістарычнага даследавання.

Адметны інтарэс выклікаў даклад нямецкага даследчыка К. Ганцара «Нямецкія і савецкія страты як паказчык працягласці і інтэнсіўнасці баёў за Брэсцкую крэпасць». Гісторык заўважыў, што пры вызначэнні характару баявых дзеянняў і іх працягласці на тэрыторыі крэпасці неабходна кіравацца адпаведнымі крытэрыямі, сярод якіх важнае месца займаюць фактычныя страты, якія панёс нямецкі бок у ходзе штурму баявых умацаванняў крэпасці. З дакументальных крыніц вынікае, што нямецкі бок нёс страты забітымі толькі ў першыя 5 дзён баявых дзеянняў, тады як у наступныя дні колькасць страт 45-й пяхотнай дывізіі павялічвалася ў выніку смерці салдат у лазарэтах ад ран, якія былі атрыманы ў час баёў. Датычна савецкага боку даследчык прыводзіць звесткі аб колькасці чырвонаармейцаў, якія трапілі ў нямецкі палон, пачынаючы з 22 і па 30 чэрвеня 1941 года. Паводле новых дакументаў, упершыню выяўленых даследчыкам, легендарны абаронца крэпасці, маёр П.М. Гаўрылаў трапіў у палон не на 32-і, а на 33-і дзень вайны, г.зн. толькі 24 ліпеня 1941 г.

У паведамленнях, заслуханых на другім пленарным пасяджэнні, звярталася ўвага на новыя дакументальныя знаходкі і гістарыяграфічныя факты па малавядомых старонках гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У ходзе пасяджэння прагучалі паведамленні, якія закраналі наступную тэматыку: «Савецкая школа ваеннай гістарыяграфіі: міфы або рэальнасць» (Я.П. Бязлепкін), «Беларусь і савецкі тыл у гады Вялікай Айчыннай вайны: цяперашні погляд» (І.Ю. Варанкова), «Віцебскае антыфашысцкае падполле: асаблівасці вывучэння архіўных крыніц і адлюстраванне ў навуковай літаратуры» (С.К. Ганцова), «З гісторыі даследавання германскай гістарыяграфіі нацысцкай культурнай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі» (У.Я. Калаткоў), «Германа-беларускія эканамічныя сувязі другой паловы 20–30-х гг. XX ст.» (Д.А. Мігун), «Дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь аб дзейнасці Бялыніцкай і Круглянскай ваенна-аператыўных груп)» (С.П. Кубека), «Баявое супрацоўніцтва ваеннапалонных: беларусы ў супраціўленні лагераў Баварыі» (В.П. Паўлаў), «Жанчыны Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне» (А.С. Хадасевіч).

У час правядзення трэцяга пленарнага пасяджэння былі заслуханы даклады і паведамленні, у якіх даследчыкі паказвалі Беларусь праз прызму часу, акцэнтуючы ўвагу не столькі на старонках ваеннай гісторыі, колькі на канкрэтных людзях і іх незабыўных лёсах. Адкрываў пасяджэнне У.К. Коршук тэмай «Вайна і лёсы людзей», які на сабе, будучы малалетнім хлапчуком пазнаў выпрабаванні вайны, што назаўсёды засталіся ў памяці і па цяперашні час нагадваюць аб сабе, як незагоеная рана. Вымярэнне вайны праз лёсы канкрэтных людзей, прычым незалежна ад званняў і пасад, была і застанецца адной з актуальных задач беларускай гістарычнай навукі.

У дакладзе М.В. Стральца ішла размова аб перамешчаных асобах, якія апынуліся ў пасляваеннай Германіі. На думку гісторыка, у першыя пасляваенныя гады існавалі дзве незалежныя адна ад другой галіны яўрэйскага жыцця – з аднаго боку, перамешчаных асоб з Усходняй Еўропы, а з другога – адноўленыя яўрэйскія абшчыны, якія перажылі катастрофу. Пры гэтым большасць перамешчаных асоб разглядалі Германію як прамежкавую станцыю на сваім шляху на гістарычную радзіму. Аўтар робіць выснову, што германскія яўрэі выказвалі занепакоенасць дамінаваннем усходнееўрапейскіх братоў па веры. Наступствам гэтага стала выпрабаванне, звязанае з разрывам асобных абшчын.

Аб лёсе мясцовага нямецкага этнасу ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны вялася размова ў дакладзе У.В. Тугая (Мінск), які паказаў актыўны ўдзел некаторых немцаў у барацьбе на баку патрыятычнага супраціву ў дачыненні да германскіх захопнікаў. Агульная колькасць «беларускіх фольксдойчэ», якія сталі ўдзельнікамі гэтай барацьбы і загінулі, пакуль устанавіць не ўдалося.

У дакладзе «Змены дынамікі колькасці і нацыянальнага складу насельніцтва Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны» В.П. Дзмітрыева характарызуе ўмовы, якія склаліся на значнай частцы тэрыторыі Беларусі пасля пачатку ваенных дзеянняў і акупацыі беларускіх зямель. Аднак і ў тых умовах актуальным заставалася пытанне аб самавызначэнні асноўнай часткі беларускага грамадства і нацыянальна-дэмакратычнай інтэлігенцыі.

У паведамленнях, заслуханых падчас трэцяга пленарнага пасяджэння, даследчыкі аналізуюць розныя аспекты не толькі ваеннай гісторыі, але і іншыя аспекты найноўшай гісторыі Беларусі, пытанні палітыкі, эканомікі, культуры і г.д., якія былі адлюстраваны Я.І. Бараноўскім – «Роля Беларусі ў падрыхтоўцы зарубежных спецыялістаў (1980–1990)», В.М. Галай – «Германізмы ў рэпрэзентацыі падзей Вялікай Айчыннай вайны (на матэрыяле творчасці Васіля Быкава)», С.Б. Жарко – «Станаўленне адносін Кіеўскай Русі з Германіяй ў X ст.», К. Князевым – «Дакументы фондаў НАРБ як крыніца па вывучэнні гісторыі Рэйхскамісарыята Остланд», І.М. Кузняцовым – «Месца масавых расстрэлаў і пахаванняў на тэрыторыі Беларусі (1941–1944): праблемы ўвекавечання памяці», А.М. Кушнярэвічам – «Архітэктурна-будаўнічая дзейнасць дойліда А. Кромера на Беларусі», А.А. Лапінай – «Даследаванне злачынстваў ваеннага часу (1941–1944)»,

В.В. Лінвін-Савіч – «Рэмінісцэнцыі палітычнай праграмы германскай каталіцкай партыі “Цэнтр” у палітычнай дзейнасці епіскапа Віленскай каталіцкай епархіі Эдварда фон дер Ропа (1906–1908)», І.А. Літвіноўскім і Ю.І. Літвіноўскай – «Савецка-германскія эканамічныя сувязі ў міжваенны перыяд 1921–1939 гг.)», В.Я. Лагавік – «Вайна ў творчасці беларускіх мастакоў (гуманістычны аспект)», У.В. Ляхоўскім, В.А. Кунавіч – «Знешнегандлёвыя адносіны Германіі і Расіі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя», В.Г. Мазцом – «Чыгуначны транспарт Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны», І.А. Саракавіком – «Дагавор 1229 года – прыклад вырашэння наспелых праблем паміж народамі», Д.П. Пясецкім – «Канцэпцыя мытнага саюза Фрыдрыха фон Ліста», Н.Л. Улейчык, Н.А. Царук – «Адлюстраванне этнакультурнай спецыфікі Гродзенскай губерні ў сістэме адукацыі напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны», Р.Р. Хісамутдзінавай – «Праблема калабарацыянізму ў расійскай гістарыяграфіі».

У заключэнне былі падведзены вынікі працы ўдзельнікаў канферэнцыі. Пры гэтым адзначана, што навуковае абмеркаванне гістарычнага феномена Вялікай Айчыннай вайны і звязанай з ёй даследчыцкай праблематыкай у фармаце штогадовай канферэнцыі з’яўляецца добрай традыцыяй у сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Месцам такіх сустрэч і надалей бачыцца Цэнтр беларускай мовы і культуры МДЛУ, дзе створана цёплая і добразычлівая атмасфера, без чаго немагчыма разлічваць на творчы навуковы пошук. Актыўнае супрацоўніцтва гісторыкаў у фармаце такіх сустрэч – трывалы падмурак для правядзення наступных канферэнцый. Як добрую прыкмету закладзенай шматгадовай традыцыі ўдзельнікі адзначылі выданне зборніка матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць».

*Сяргей Новікаў,*
кандыдат гістарычных навук